# Да 500-годдзя з дня нараджэння Леанардо да Вінчы

Грамадскасць нашай рэспублікі адзначае 500-годдзе з дня нараджэння вялікага італьянскага мастака Леанардо да Вінчы.

Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў арганізавала ў лекторыях і клубах цыкл лекцый аб жыцці і творчасці вялікага італьянскага мастака. З публічнай лекцыяй у Беларускай Акадэміі навук выступіць доктар мастацтвазнаўчых навук М. Кацар.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце імя В. І. Леніна падрыхтаваны вялікі вечар, прысвечаны юбілею мастака.

Гутаркі аб творчасці Леанардо да Вінчы праходзяць у Мінскім мастацкім вучылішчы. Адбудзецца вялікі вечар з удзелам выкладчыкаў вучылішча і мастакоў сталіцы.

Дзяржаўная бібліятэка імя В. І. Леніна адкрыла выстаўку, прысвечаную Леанардо да Вінчы. На выстаўцы ёсць вялікая колькасць альбомаў, у якіх сабраны рэпрадукцыі з карцін Леанардо.

Значную цікавасць прадстаўляюць таксама рэдкія выданні кніг, якія прысвечаны жыццю і творчасці выдатнага дзеяча італьянскай культуры.